4. Берн, Ш. Гендерная психология / Ш. Берн – СПб. : «Прайм-ЕВРО-ЗНАК», 2001. – 318 с.
5. Узы брака, узы свободы. Проблемы семьи и одиночества глазами учёных. Сб. ст. / Сост. Т. Разумовская. – М. : Молодая гвардия, 1990. – 222 с.
6. Сексопатология. Справочник / Под ред. Г. С. Васильченко. – М. : «Медицина», 1990. – 575 с.
7. Эриксон, Э. Детство и общество / Э. Эриксон. – СПб. : ЛенАТО АСТ фонд «Университетская книга», 1996. – 590 с.
8. Лагонда, Г. В. Сексуальность и брак: грани интимных отношений / Г. В. Лагонда // Веснік Брэсцкага універсітэта. Серыя гуманітарных і грамадскіх навук. – 2008. – № 1 (32). – С. 84 – 89.

Ключевые слова: брачные отношения, брачные потребности, сексуальность, функция.

Kay words: marriage relations, marriage requirements, sexuality, function.

Основная задача, которую решает автор статьи – это составление перечня брачных потребностей человека. Для обоснования своей точки зрения он отталкивается от идеи о том, что супружество является разновидностью гендерных отношений. По мнению автора, гендерные отношения человека в целом и брачные в частности обеспечиваются специфической функциональной системой – сексуальностью. В статье рассматриваются прокреативная, рекреативная, коммуникативная и символическая функции сексуальности. Доказывается их связь с брачными потребностями.

The author of the article works out the problem of composition of matrimonial needs enumeration. For a basing his own point of view he exploits the idea that a conjugality is kind of gender relations. From the author opinion a sexuality is such functional system that assures both a gender relations in all and a marriage relations in particular. The author describes procreative, recreative, communicative and symbolical functions of sexuality. He proves their connections with matrimonial needs.

УДК101.8

# КАНФЕСІЙНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ ЯК МАРАЛЬНЫЯ РЭГУЛЯТЫВЫ ГРАМАДСКАГА ЖЫЦЦЯ Ў ГІСТОРЫІ ФАРМІРАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

ЛАГУНОЎСКАЯ А. А.

*Брэсцкі дзяржаўны універсітэт ім. А. С. Пушкіна, г. Брэст, Беларусь*

Духоўна-маральная спадчына гістарычнага мінулага Беларусі і канфесійныя каштоўнасці як яе неад’емная частка з’яўляецца найважнейшым фактарам, які ўплывае на фарміраванне структурных складнікаў маральнай культуры сучаснага беларускага грамадства: ідэалаў, ведаў, вопыту, пачуццяў. Асэнсаванне і аднаўленне гістарычнага мінулага звязана з неабходнасцю вырашэння надзённых задач сучаснасці, накіраваных на развіццё духоўнай сферы грамадства і яго маральнай культуры. Найбольш значным у сувязі з гэтымі задачамі уяўляецца зварот да генезісу беларускай дзяржаўнасці ў Полацкім княстве і Вялікім Княстве Літоўскім, калі сапраўды грандыёзныя

грамадскія праблемы вырашаліся на духоўна-маральных рэгулятыўных асновах. Працэс духоўнага станаўлення беларускай нацыі і дзяржавы, які ажыццяўляўся на аснове агульнасусветных, еўрапейскіх заканамернасцяў, ўпісаўся ў агульны кантэкст духоўных дасягненняў чалавецтва.

Агульнаеўрапейскія працэсы фарміравання дзяржаўнасці набіраюць сілу з IX ст.: адбываецца фарміраванне дзяржаўных утварэнняў вакол гарадоў Полацка, Кіева, Ноўгарада, фарміраванне каралеўстваў Англіі, Францыі, Германіі… У той час, калі ў Кіеве замацаваўся заходнееўрапейскі прыклад перадачы ўлады ад бацькі да старэйшага сына, у Полацку, Ноўгарадзе, Пскове працягваліся славянскія традыцыі народаўладдзя і пасада князя заставалася выбарнай: веча абірала князя і кантралявала яго дзейнасць, а ў выпадку парушэння пастаўленых умоваў «паказвала князю шлях», г. зн. пазбаўляла яго пасады, як гэта здарылася, напрыклад, з Рагвалодам Барысавічам у 1151 г. і Расціславам Глебавічам у 1158 г. [1, с. 35]. Паўнамоцтвы князя знаходзіліся ў прамой залежнасці ад яго асабістых здольнасцяў. Асаблівай падтрымкай і любоўю палачан карыстаўся князь Усяслаў, у княжанне якога (1044–1101) Полацкае княства дасягнула найбольшай магутнасці, была пабудавана Полацкая Сафія – чацвёрты ва ўсёй Еўропе храм такога тыпу.

Маральная рэгуляцыя сацыяльна-палітычнага жыцця ў перыяд феадальнай раздробленасці і мангола-татарскага нашэсця на Кіеўскую Русь (XII–XIV стст.) была абумоўлена мэтай захавання незалежнасці старабеларускіх земель. У дадзены часовы перыяд тут, гэтак жа як і ў Заходняй Еўропе (Англіі, Францыі, Германіі), шляхам інтэграцыі адбывалася фарміраванне цэнтралізаванай дзяржавы, тады як дзяржаўныя аб'яднанні Кіеўскай Русі праходзілі этап феадальнай раздробленасці. У Заходняй Еўропе і Кіеўскай Русі перадача вярхоўнай улады ў дзяржаве па старшынстве абумоўлівала немагчымасць законным чынам прэтэндаваць на пасаду кіраўніка ўсім жадаючым. Часта асобы, пазбаўленыя магчымасці кіраваць, імкнуліся заняць гэтую пасаду з дапамогай любых сродкаў і метадаў, у тым ліку і гвалтоўных, аж да ваенных дзеянняў паміж насельнікамі адной дзяржавы. Зрушэнне манархаў было распаўсюджана ў перыяд Сярэднявечча ў Заходняй Еўропе і Кіеўскай Русі, і часцей за ўсё ў такіх выпадках іх пазбаўлялі жыцця. У X–XVI стст. сацыяльна-палітычныя асновы жыцця старабеларускіх земель абумовілі функцыянаванне маральнай культуры як адзінства, якое замацоўвала фарміраванне агульных правіл, высвятляючых абавязкі ў дзейнасці асобы і грамадства. Спецыфіка сацыяльна-палітычнага развіцця старабеларускіх земель пры адмове ад спадчыны па старшынстве ў той перыяд давала магчымасць прадстаўнікам эліты свабоднага выбару сваёй жыццёвай стратэгіі як накіраванасці на дасягненне жаданага сацыяльнага становішча. Калі сын князя, які кіраваў, імкнуўся заняць пасаду, якая належыла раней бацьку, ён, як і ўсе астатнія прэтэндэнты на вярхоўную ўладу ў дзяржаве, вылучаў сваю кандыдатуру. Толькі пры ўмове найбольшай адпаведнасці асобасных якасцяў і здольнасцяў пасадзе князя ў параўнанні з іншымі прэтэндэнтамі чалавек мог быць абраны. Свядомыя паводзіны, накіраваныя на дасягненне мэтаў свайго жыцця, як каштоўнасная арыентацыя асобы спрыяюць ўмацаванню пачуцця адказнасці за свой выбар, добрасумленнасці ў выкананні абавязкаў, якія вынікаюць з яго. Дадзеныя маральныя нормы старабеларускага грамадства сведчаць аб магчымасці раскрыцця творчага патэнцыялу чалавека ў

працэсе рэалізацыі сваёй жыццёвай канцэпцыі на аснове канструктыўных, гуманістычных сродкаў і метадаў.

Творчыя людзі на тэрыторыі Беларусі валодалі свабодай у выбары не толькі сваёй сацыяльнай, але і культурнай арыентацыі (у сэнсе імкнення да грамадскіх ідэалаў і прыняцця пэўных культурных узораў). Першы помнік пісьменства, створаны на беларускіх землях, – «Жыціе Еўфрасінні Полацкай» – адлюстроўвае імкненне неардынарнай асобы пераадолець стэрэатыпы і забароны на шляху да самавыяўлення і творчасці. У жыцці ўнучкі князя Усяслава Чарадзея ўладанне матэрыяльнымі каштоўнасцямі і ўладай, якія вынікалі з княжага становішча, не адыгрывала галоўнай ролі. У іерархіі хрысціянскіх каштоўнасцяў грамадскія, калектыўныя інтарэсы стаяць вышэй за асабістыя. Тым не менш у працэсе актыўнай сацыяльнай дзейнасці арыентацыя на духоўныя каштоўнасці хрысціянства спрыяе раскрыццю духоўнага патэнцыялу асобы, дасягненню ўсіх намечаных чалавекам мэтаў і яго максімальнай самарэалізацыі. Напрыклад Мікола Гусоўскі, з'яўляючыся сынам лесніка, прадстаўляў інтарэсы Вялікага Княства Літоўскага ў якасці дыпламатычнага амбасадара ў Ватыкане, які адыгрываў магутную ролю ў знешняй палітыцы таго часу. Сын купца «сярэдняй рукі» Францыск Скарына змог не толькі паступіць у адзін з найстарэйшых і самых прэстыжных універсітэтаў Еўропы – Падуанскі, але і дабіцца, у сілу адсутнасці грошай, бясплатнага ў ім навучання, атрымаўшы пасля яго заканчэння доктарскую ступень. Дасягнуўшы вяршынь сярэднявяковай адукаванасці, Францыск Скарына прысвяціў жыццё служэнню свайму народу – «людзям паспалітым». Такім чынам, творчы пошук і актыўная жыццёвая пазіцыя Еўфрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Міколы Гусоўскага, Францыска Скарыны, Меленція Сматрыцкага, Афанасія Філіповіча і іншых прадстаўнікоў старабеларускай культуры паўстаюць як праўдзіва духоўны феномен, які вызначыў канфесійныя каштоўнасці на паводніцкім узроўні ў служэнні Радзіме і імкненні да духоўна-маральнай дасканаласці, множання сваіх ведаў, здольнасцяў і магчымасцяў незалежна ад сацыяльнага статусу, маёмаснага становішча і паходжання.

Пры даследаванні канфесійных каштоўнасцяў як маральных рэгулятываў грамадскага жыцця ў перыяд Полацкага княства і ВКЛ, неабходна звярнуць увагу на такі важны фактар, які аказаў уплыў на фарміраванне светапоглядных асноў беларускай дзяржаўнасці як узаемадзеянне культур Захаду і Усходу. Асаблівасці асяроддзя пражывання спрыялі замацаванню ў менталітэце беларускага народа талерантнасці, памяркоўнасці, стрыманасці ў меркаваннях, сістэмнасці мыслення, якія адпавядаюць хрысціянскім прынцыпам паводзін, зносін і дзейнасці, шо хутчэй спрыяла самаідэнтыфікацыі беларускага этнасу.

Характэрнай асаблівасцю Беларусі з'яўляецца поліканфесійная рэлігійная структура. Вызначальную ролю ў сацыякультурнай прасторы Беларусі іграе хрысціянства, і перш за ўсё дзве асноўныя канфесіі – праваслаўе і каталіцтва. Асаблівасці ўзаемадзеяння паміж хрысціянскімі канфесіямі, кожная з якіх фарміравала свой культурны стэрэатып, фактычна па-свойму інтэрпрэтуючы зыходную хрысціянскую традыцыю і спрабуючы ў той ці іншай меры яе прайграваць, былі абумоўлены тым, што ў культуры ВКЛ сутыкнуліся дзве не зусім чужародныя, але вельмі розныя паводле гістарычнага развіцця культуры, якія вядомы італьянскі славіст Р. Пікіа вызначыў як Slavia Orthodoxa і Slavia

Romana, што прывяло да ўзаемадзеяння розных культурных стэрэатыпаў, розных хрысціянскіх традыцый і вымусіла так ці інакш парваць з адзінай хрысціянскай традыцыяй. Такім чынам, у адзінай хрысціянскай традыцыі на беларускіх землях сфарміраваліся і развіваліся дзве традыцыі, несумяшчальныя адна з адной – ісіхазм і гуманізм, прасякнутыя вострай рэлігійнай палемікай у эпоху «залатога стагоддзя».

Праваслаўныя беларускія землі, якія ўвайшлі ў XV–XVI стст. у арэал заходнееўрапейскай каталіцкай культуры, вымушаныя былі захоўваць і адстойваць сваю культурную ідэнтычнасць у канфесійнай, бытавой, моўнай, творча-мастацкай, гістарыялагічнай, генеалагічнай, геапалітычнай і іншых сферах. Ісіхасцкае вучэнне (паламізм), якое заклікае да маўклівага разумнага дзеяння, і, як яго вынік, асабістыя зносіны з Богам і абагаўленне хрысціяніна ў яго яшчэ зямным быцці, аказала важны ўплыў на працэс духоўнага станаўлення беларускага народа. Нездарма цэнтральнай праблемай ісіхасцкай антрапалогіі стала праблема абагаўлення і асабістага богападабенства – праблема вобраза і падабенства Божага ў чалавеку як падстаў чалавечай асобы. Ісіхазм і гуманізм – два шляхі развіцця хрысціянскай цывілізацыі, прадстаўленыя ў гістарычным развіцці Беларусі XIV–XVI стст. – знайшлі сваё адлюстраванне ў Статутах ВКЛ і развіцці беларускай духоўнасці ў наступныя эпохі.

Статут Вялікага Княства Літоўскага – першы збор законаў у феадальнай Еўропе, распрацаваны навукоўцамі і юрыстамі-практыкамі старабеларускай дзяржавы на аснове кадыфікацыі і сістэматызацыі норм мясцовага права, выйшаў у 1529 г. Напісаны на старабеларускай мове, ён быў даступны ўсім пісьменным людзям таго часу. Прававыя нормы, выкладзеныя ў Статуце, у сваёй сукупнасці складалі своеасаблівую феадальную канстытуцыю, у якой былі закладзены новыя прынцыпы адзінства права і прыярытэту пісанага права. Такім чынам склалася парадаксальная сітуацыя: у ВКЛ развіццё права апярэдзіла развіццё капіталістычных адносін. Феадальным адносінам таго часу была ўласцівая строгая іерархічнасць: эканамічныя, палітычныя, сацыяльныя правы належалі выключна першаму і другому саслоўям, у той час як трэцяе саслоўе, якое было бяспраўным, забяспечвала іх дабрабыт.

Менавіта з асяроддзя трэцяга саслоўя ў Заходняй Еўропе вылучылася буржуазія, барацьба якой за свае правы і прывяла пасля да падрыхтоўкі Канстытуцыі ЗША (1786), французскай Дэкларацыі правоў чалавека і грамадзяніна (1789). На беларускай тэрыторыі адзначаліся нізкія тэмпы генезісу буржуазных адносін: нават у XIX ст. колькасць гандлёвых і гільдый купецтва, здольных паўплываць на ўзмацненне працэсу капіталізацыі, была нязначнай. Аднак узровень развіцця цэхавай вытворчасці, які падтрымліваўся прадстаўнікамі першага саслоўя ў ВКЛ, у тым ліку і самым буйным зямельным уласнікам – вялікім князем, аказаў дэтэрмінуючае ўздзеянне на дэмакратычныя нормы Статутаў, што адпавядала дзяржаўным працэсам таго часу.

У рэчышчы хрысціянскай асветы Статуты замацоўвалі канфесійныя каштоўнасці – маральныя нормы жыццядзейнасці грамадства на дзяржаўным узроўні. Творчы і духоўна-маральны патэнцыял каштоўнасцяў хрысціянства ў сваёй асветніцкай дзейнасці выкарыстоўвалі Еўфрасіння Полацкая, Клімент Смаляціч, Кірыла Тураўскі і іх паслядоўнікі. Яшчэ Кірыла Тураўскі сцвярджаў: «Аще бо в глубину Божиих книг внидох, …Бог же мира многою милостию да

створит вашему отчьству…» [2, с. 425]. Францыск Скарына імкнуўся данесці «люду простаму, паспалитаму» каштоўнасці хрысціянства, якія змяшчаюцца ў Бібліі. Прадстаўнікі свецкай літаратуры, заснаванай на хрысціянскіх каштоўнасцях, у эпоху Адраджэння «ўпершыню ў нашым рэгіёне перанеслі хрысціянскую любоў, дабро і праўду на свой народ, сваю краіну і родную мову» (У. Конан).

У эпоху Адраджэння індывідуалізм заходнееўрапейскага грамадства, заснаваны на антрапацэнтрызме, прывёў да ўзброенай барацьбы буржуазіі за свае правы, вынікам якой з’явілася стварэнне і развіццё права ў яго пазітывісцкім варыянце. У пазітывісцкай канцэпцыі сутнасць права вызначаецца зыходзячы з рэальнай сітуацыі: правы чалавеку дае дзяржава пры ўмове, што ён з’яўляецца грамадзянінам, а цэнтральнымі паняццямі выступаюць «норма», «прымус», «аўтарытэт». Згодна з натуральна-прававой канцэпцыяй, прыхільнікамі якой з’яўляліся Ф. Скарына, С. Будны, М. Літвін, А. Волан і інш., сутнасць права заключаецца ў ідэі права: у тым, якім права павінна быць, а яго змест раскрываецца праз паняцці «свабода», «розум», «справядлівасць» і інш. Сама прыналежнасць да чалавечага роду ў натуральна-прававой канцэпцыі разглядаецца як галоўная ўмова для атрымання чалавекам права на жыццё, свабоду, асабістую недатыкальнасць, што адпавядае прынцыпам хрысціянства: правы чалавек набывае пры нараджэнні, таму што ён іх варты. Каштоўнасцю хрысціянства з’яўляецца павага да ўсіх людзей, створаных па вобразе і падабенстве Божым. У хрысціянстве вобраз і падабенства Божае выступаюць як ідэал, дзейснае імкненне да якога ўзвышае чалавека, спрыяе фарміраванню маральнай культуры адносін з людзьмі і грамадствам. Носьбітам хрысціянскай свядомасці ў перыяд Полацкага княства і ВКЛ была перш за ўсё эліта, якая імкнуўся ўвасобіць на практыцы хрысціянскі ідэал маральнага жыцця (пра што сведчыць інстытуцыяналізацыя каштоўнасцяў хрысціянства ў Статутах ВКЛ).

У перыяд генезісу і станаўлення беларускай дзяржаўнасці агульначалавечыя маральныя нормы і гуманістычныя каштоўнасныя арыентацыі, якія развіваліся ў рэчышчы хрысціянскага светапогляду, з’явіліся платформай для фарміравання першапрычын грамадзянскай супольнасці. Як асноўны закон, Статуты фарміравалі асноўную лінію мэтапакладання грамадства і кожнай асобы, рэпрэзентуючы адзінства індывідуальнага і грамадскага, закліканае рэалізавацца ў сацыяльнай практыцы з дапамогай індывідуальнага ўдзелу. Феномен маральна-прававой рэгуляцыі дазваляў упарадкоўваць, падтрымліваць у пазітыўна-функцыянальным стане сістэму асноўных відаў грамадскіх адносін, рухацца па шляху цывілізацыйнага развіцця ў працэсе фарміравання беларускай дзяржаўнасці. Поспехі ў вырашэнні задач дзяржаўнага будаўніцтва ў перыяд Полацкага княства і ВКЛ сведчаць пра канструктыўны характар абранага кірунку развіцця грамадства і дзяржавы, заснаванага на канфесійных каштоўнасцях.

Литература

1. Ігнатоўскі, У. М. Кароткі нарыс гісторыі Бедарусі / У. М. Ігнатоўскі. – 5-е выд. – Мінск : Беларусь, 1992. –190 с.

2. Тураўскі, К. Творы Кірыла Тураўскага / К. Тураўскі // Кірыл, епіскап Тураўскі: Жыцце. Спадчына. Светапогляд / склад. і навук. рэд. А. А. Мельнікаў. – Мінск, 2000. – С. 252–452.

Ключавыя словы мараль, духоўнасць, канфесійныя каштоўнасці, хрысціянства, маральная культура, Полацкае княства, Вялікае Княства Літоўскае.

Kay words morality, spirituality, confessional values, Christianity, moral culture, Polotsk principality, Grand Duchy of Lithuania.

Прадстаўлена аўтарскае бачанне фарміравання маральных асноў старабеларускага грамадства ў кантэксце духоўных каштоўнасцей хрысціянства. Разглядаюцца сацыяльны механізм распаўсюджвання канфесійных каштоўнасцей, працэсы духоўна-маральнай жыццядзейнасці народа. Асаблівая ўвага надаецца феномену маральна-прававой рэгуляцыі.

Lahunouskaya A.A. The author's vision of the formation of the moral foundations of the old Belarusian society in the context of the spiritual values of Christianity is presented. The social mechanism of dissemination of confessional values, processes of spiritual and moral life of the people are considered. Particular attention is paid to the phenomenon of moral and legal regulation.

УДК 101.1:316

# ВЗАИМОДЕЙСТВИЕ ЦЕРКВИ И ОБЩЕСТВА: ТРАДИЦИИ И ИННОВАЦИИ

ЛИСОВСКАЯ Т. В.

*Брестский государственный технический университет,*
*г. Брест, Беларусь*

В условиях трансформации современного общества изменениям подвержены и взаимоотношения общества с церковью. В современной науке существуют три ключевых гипотезы о положении религии и церкви в обществе: во-первых, фиксируется тенденция к повсеместному снижению роли церкви в обществе под давлением достижений научно-технического прогресса, во-вторых, отмечаются секуляризационные процессы преимущественно в странах с высоким уровнем благосостояния, однако среди стран третьего мира фиксируется более высокий уровень религиозности[1]. В-третьих, наметилась тенденция к трансформации мировых религий в пользу индивидуалистских предпочтений, к религиозности вне рамок традиционных религиозных организаций. Все три данные гипотезы отмечают наличие секуляризационных тенденций при взаимодействии церкви и общества, индивидуализацию и приватизацию религии, что ведет к снижению институционального закрепления религиозных институтов в обществе.

Секуляризация в современном обществе проходит двумя способами – посредством институциональной и идеологической сепарации. В ходе институциональной сепарации происходит разделение институтов государства и церкви, их полномочий и сферы деятельности. Так, в Швеции в 2000 г. законодательно ликвидирован государственный статус евангельско-лютеранской церкви и началась трансформация от идентификационной модели к модели скоординированной сепарации. Те же процессы прошли в Финляндии в 1999 г. До II Ватиканского Собора ещё существовали католические государства как закрытого

[1] Согласно данным «Gallup International/WIN «Глобальный барометр надежды и отчаяния» (Global Barometer on Hope and Despair) за 2012 г.